*Г.І.. МАСКЕВІЧ*

# САЦЫЯЛЬНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ СЕЛЬСКАЙ ГРАМАДЫ БЕЛАРУСІ Ў 60-90-я гг. XIX ст.

Рассматриваются некоторые аспекты функционирования сельской общины Беларуси в 60-90-е гг. XIX в. Исследуются место и роль должностных лиц крестьянского самоуправления (волостные старшины и сельские старосты), их официальное и неформальное положение, взаимоотношения с сельским населением.

The article reviews some aspects of the activity of the village community in Belarus in 60-90-s of the XIX century. It analyzes its social organization, the role of peasant's officials (volost foremen and village headmen) among rural population, their official and informal status, the relationships with peasants.

Вызначальныя характарыстыкі краіны адлюстроўваюцца ў жыцці большасці яе насельніцтва. Самую вялікую частку беларускага грамадства ў другой палове XIX ст. складала сялянства. Да цяперашняга часу нам невядомы многія бакі асабістага жыцця селяніна, хаця толькі іх веданне дае магчымасць зразумець, шматгранна і аб'ектыўна адлюстраваць тыя ўмовы і абставіны, у якіх жыла большая частка насельніцтва Беларусі пасля адмены прыгоннага права ў другой палове XIX ст. Нашы веды пра сялянскае жыццё абмяжоўваюцца афіцыйнымі статыстычнымі дадзенымі. Эканамічны і прававы статус прадстаўнікоў сялянскага саслоўя даследаваны даволі падрабязна. Разам з тым амаль не рабілася спроб вывучэння і аналізу іншых бакоў жыццядзейнасці гэтай групы насельніцтва ў 60-90-я гг. XIX ст.

Жыццё асобнага селяніна ці сялянскай сям'і рэгламентавалася і вызначалася тым асяроддзем, у якім ён існаваў. У другой палове XIX ст. асноўнай грамадскай формай арганізацыі сялянскага жыцця і побыту з'яўлялася сельская грамада. Пасля адмены прыгоннага права грамада, якая раней у якасці грамадска-адміністрацыйнай адзінкі існавала толькі ў казённых паселішчах, распаўсюдзілася і на паселішчы былых прыватнаўласніцкіх сялян. Цяжка было знайсці сферу жыццядзейнасці, да якой не мела б дачынення сельская грамада. Яна моцна ўплывала як на жыццё асобнага селяніна, так і на існаванне ўсяго вясковага калектыву. Гэта было абумоўлена тым, што дзейнасць грамады насіла не толькі афіцыйны, але і нефармальны характер[1]. Афіцыйныя функцыі яе - эканамічныя, рэгуляцыйна-прававыя, паліцэйска-фіскальныя і інш. - былі юрыдычна замацаваны дзяржавай. Аднак грамада як асноўная форма існавання селяніна мела і шэраг нефармальных функцый, што значна ўзвышала яе ролю і ўплыў на паўсядзённае жыццё вяскоўцаў. Гэта выяўлялася ў сацыяльна-бытавым, выхаваўчым, традыцыйна-звычаёвым, этыка-прававым уздзеянні на розныя сферы сялянскага існавання. Вясковы побыт вызначаўся правіламі жыцця ў грамадзе, большая частка сельскага насельніцтва так моцна трымалася за яе, што не ўяўляла свайго іншага існавання. На агульных сходах вырашаліся важнейшыя пытанні сялянскага жыцця, якія часта тычыліся не толькі грамадскіх, але і індывідуальна-сямейных адносін. Таму перавысіць ролю грамады ў жыцці селяніна даволі складана.

Нягледзячы на гэта, у айчыннай гістарычнай літаратуры асобных даследаванняў, прысвечаных непасрэдна сельскай грамадзе, не існавала. Толькі ў калектыўных працах і энцыклапедыях, а таксама ў шэрагу прац расійскіх навукоўцаў[2] даваліся некаторыя характарыстыкі грамады выключна як грамадска-адміністрацыйнай адзінкі з упорам на яе афіцыйныя функцыі. Унутранае жыццё грамады, яе сацыяльныя характарыстыкі вельмі павярхоўна адлюстраваны ў гістарыяграфіі. Гэта пытанне часткова закранаецца ў працах этнаграфічнага характеру[3]. Некаторыя аспекты функцыяніравання сельскай грамады знайшлі адлюстраванне ў спецыяльных даследаваннях В.П. Панюціча і С.А. Талмачовай[4], аднак застаецца яшчэ шмат нявывучаных бакоў гэтага пытання.

У дадзеным артыкуле робіцца спроба асвятліць сацыяльную арганізацыю сельскай грамады Беларусі ў 60-90-я гг. XIX ст. Каб зразумець, якім чынам было пабудавана яе ўнутранае жыццё, неабходна разгледзець становішча кіруючых асоб, вызначыць іх статус у сістэме вясковай сацыяльнай іерархіі, што залежаў ад разнастайных характарыстык, сярод якіх асабістыя якасці селяніна, яго маёмаснае становішча, ступень валодання ўладай і інш. Аднак выключнае значэнне мела ўсё ж такі грамадская думка. Менавіта грамада вырашала, каго з сялян надзяліць кіруючымі паўнамоцтвамі. Для адлюстравання сацыяльнай арганізацыі грамады неабходна комплекснае вывучэнне шматлікіх акалічнасцей, якія аказвалі ўплыў на фарміраванне яе структуры.

На вяршыні структурнай пабудовы сельскай грамады стаяла сялянскае кіраўніцтва - старшыны і старасты. Грамада займала немалаважнае месца ў жыцці селяніна, таму і становішча яе кіраўнікоў у сялянскім асяроддзі было асаблівым. Гэта вызначалася не толькі тым, што службовыя асобы валодалі ўладай, большымі паўнамоцтвамі і прывілеямі ў параўнанні з іншымі аднавяскоўцамі, але і асаблівымі стаўленнямі да іх ва ўнутрыграмадскіх адносінах на нефармальным узроўні. Для кантролю за выкананнем сваіх афіцыйных функцый сельская грамада сама выбірала з ліку сялянскага саслоўя валасных старшын і сельскіх стараст, чыё сацыяльнае становішча адразу ўзвышалася пры атрыманні кіруючых паўнамоцтваў. Такім чынам, селянін не проста існаваў у грамадзе, падпарадкоўваючыся яе правілам і нагляду, а непасрэдна ўдзельнічаў у фарміраванні яе структуры і ўплываў на грамадскае жыццё. Першапачаткова сяляне самі вырашалі, каму са свайго асяроддзя даверыць афіцыйнае кіраўніцтва.

Прадстаўнікі кіруючых пасад адрозніваліся ад іншых членаў грамады не толькі сваімі высокімі абавязкамі, але і шэрагам асабістых ільгот. Напрыклад, валасны старшына разам са сваёй сям'ёй пазбаўляўся на час службы ад рэкруцкай павіннасці, за два трохгоддзі бездакорнай службы «вызваляўся асабіста назаўсёды, а за тры тэрміны - ён асабіста назаўсёды і адзін з яго сваякоў па выбары»[5]. Не выклікае сумнення, што кожны член грамады не адмовіўся бы заняць такую пасаду. Аднак зрабіць гэта маглі далека не ўсе. Шмат залежала ад асабістага аўтарытэту селяніна і павагі да яго з боку аднавяскоўцаў. Гэта значыць, што нефармальнае становішча селяніна мела непасрэдны ўплыў на яго магчымасці заняць афіцыйную пасаду. Вырашаючы пытанні аб выбарах, грамада прад'яўляла да кандыдатаў высокія патрабаванні, а грамадская думка была даволі строгай і не дазваляла прапусціць непрыдатных асоб. Што ж з'яўлялася галоўным у якасцях будучага кіраўніка, якія асабістыя характарыстыкі гаспадара для грамады былі вызначальнымі?

На службовыя пасады звычайна выбіралі найбольш адукаваных і багатых асоб, паколькі выбраныя неслі крымінальную адказнасць за няправільныя рашэнні сходу[6]. Сяляне былі зацікаўлены, каб на пасаду свайго кіраўніка прызначыць найбольш здольнага да гэтай справы чалавека, які ў грамадзе павінен быў зарэкамендаваць сябе як добры і дбайны гаспадар. Нездарма гаспадары «намагаюцца... паказаць сябе перад грамадой працавітымі»[7]. Таму не выклікае сумнення, што для селяніна вельмі важным было заваяваць грамадскую павагу. Роля грамадскай думкі ў дадзеным выпадку была вызначальнай. Такая, здавалася б, простая з'ява, як працавітасць, была адным з аспектаў вызначэння сацыяльнага статусу, падмуркам для заваёвы асабістага аўтарытэту. Вельмі важным паказчыкам для атрымання грамадскай павагі быў дабрабыт селяніна. Толькі дбайны гаспадар мог валодаць аўтарытэтам у грамадзе, далека не ўсе члены якой вызначаліся падобнымі рысамі. Яшчэ А.С. Дэмбавецкі пісаў, што сярод «худых» рыс беларускага селяніна ёсць недастатковая дбайнасць аб сваім

дабрабыце, даходзячая часам да недахопу працавітасці[8]. Часта сярод асноўных заган беларускага сялянства вызначаліся нядбайнасць і лянота[9]. Таму можна пагадзіцца, што найбольш дбайны гаспадар валодаў сярод сялян большым аўтарытэтам, адпаведна меў большыя магчымасці для ўзвышэння свайго сацыяльнага статуса сярод аднавяскоўцаў праз выбранив старастай або старшыной.

Кожны асобны селянін меў магчымасць паўплываць на дзейнасць і рашэнні грамады, дамагчыся таго, каб заняць кіруючую пасаду і атрымаць высокі статус сярод аднавяскоўцаў. Для гэтага патрэбна было пераканаць грамаду ў сваіх высокіх гаспадарчых якасцях. Зразумела, што ў працавітага і дбайнага гаспадара і гаспадарка будзе знаходзіцца ў квітнеючым стане. Гэта значыць, што па эканамічных паказчыках такія сяляне таксама ўзвышаліся над грамадой. Адсюль вынікае і тая акалічнасць, што на кіруючых пасадах часцей апыналіся найбольш забяспечаныя вяскоўцы. Нельга казаць пра прамы ўплыў эканамічных паказчыкаў на асабісты аўтарытэт селяніна, але сувязь паміж афіцыйным і неафіцыйным становішчам усё ж такі існавала, і селянін імкнуўся выкарыстоўваць розныя сродкі, каб дамагчыся грамадскай павагі.

Грамада, выбіраючы сваё кіраўніцтва, безумоўна, надзяляла яго высокімі якасцямі, выказваючы такой асобе поўны давер, дазваляючы вырашаць важныя пытанні свайго жыцця, прадстаўляць і абараняць свае інтарэсы перад прадстаўнікамі вышэйшых улад. Аднак часта здаралася так, што сялянскае кіраўніцтва не апраўдвала аказанага яму даверу з боку аднавяскоўцаў. Выбар грамады мог здарыцца памылковым. Сяляне некалькіх валасцей Барысаўскага павета скардзіліся, што выбраныя імі старшыны аказаліся няздольнымі да нясення такой службы, з'яўляюцца цяжарам для воласці і сваімі дзеяннямі толькі пагаршаюць сялянскі побыт, чым канчаткова губляюць павагу сярод сялян[10]. Такія акалічнасці часта былі абумоўлены тым, што селянін, які дамогся сваіх мэт і атрымаў уладу над грамадой, мяняў свае паводзіны ў супрацьлеглым кірунку, забываючыся на грамаду і дзейнічаючы толькі ў сваіх уласных інтарэсах. У такіх выпадках ён аказваўся амаль што выключаны з неафіцыйнай структуры грамады, таму што поўнасцю губляў ранейшую грамадскую павагу і аўтарытэт. У вачах аднавяскоўцаў ён ужо не валодаў ніякай перавагай. Нават афіцыйная пасада не надавала яму ні грамадскай павагі, ні аўтарытэту. Хутчэй, наадварот, злоўжыванне сваімі паўнамоцтвамі адмоўна уплывала на нефармальны статус старшыны альбо старасты.

Галоўнымі падставамі для незадаволенасці кіраўніцтвам з'яўляліся п'янства і выкарыстанне службовымі асобамі фізічнай сілы ў дачыненні да сялян. Жыхар Віцебскай губерні паведамляў, што стараста «кінуўся з шаленствам на маю жонку, схапіў яе за грудзі і плечы... штурхнуў з сілаю раз'юшанага чалавека»[11]. Ёсць сведкі, што ў адным з выпадкаў старшына розгамі высек вока селяніну[12]. Шматлікія дакументы змяшчаюць разнастайныя скаргі сялян на несправядлівыя дзеянні свайго кіраўніцтва, неабгрунтаваныя арышты, няправільныя надзяленні зямлёй, нанясенне пабояў, несправядлівыя налажэнні штрафаў, прыманне хабару, неаб'ектыўныя вырашэнні спрэчных спраў і інш. Часта здаралася, што кіруючыя асобы сельскай грамады выкарыстоўвалі свае пасады на асабістую карысць: «...стараста будаваў сабе хату па казённай нядоімцы (якой не было) узяў сабе 18 рублёў з сялян»[13].

Грамада не атрымлівала задавальнення сваіх патрэб ад кіраўніцтва, ей жа самой I выбранага, аднак змяніць сітуацыю членам грамады не заўсёды прадстаўлялася магчымым. Часта пасля выбару кіраўніка сяляне ўжо не маглі ніяк паўплываць на існуючае становішча. Гэта добра разумелі старшыны і старасты, таму і дазвалялі сабе падобныя, неадпавядаючыя грамадскім запатрабаванням паводзіны. Яны ведалі, што вынік наступных

выбараў будзе вырашацца выключна іх уладай, сувязямі, набытымі за час знаходжання на пасадзе, і фінансавымі магчымасцямі. Справа ў тым, што сяляне надзялялі асобу кіруючымі абавязкамі, але гэту кандыдатуру павінен быў зацвердзіць яшчэ міравы пасрэднік. Без яго згоды прызначэння на пасаду не адбывалася, таму прадстаўнікі сялянскага кіраўніцтва часта «дамаўляліся» з пасрэднікамі, даючы хабар. Маюцца выпадкі, калі міравыя пасрэднікі прызначалі старшын без згоды грамады альбо памешчыкі не дазвалялі змяніць патрэбных сабе стараст, і грамада была няздольнай на што-небудзь паўплываць.

Супрацоўніцтва з прадстаўнікамі вышэйшых саслоўяў і ўрадавых колаў выклікала незадавальненне грамады і вялікую непавагу з боку аднавяскоўцаў да свайго кіраўніцтва. У адным з паветаў Гродзенскай губерні сяляне скардзіліся, што стараста выдаваў хлеб (з сельскіх магазінаў. - *Г. М.)* двараніну і памешчыку[14]. Аб бясчынствах афіцыйных сельскіх асоб, ігнараванні імі сялянскіх інтарэсаў сведчыць і наступны прыклад: «...самачынна ім (старшыной. - Г. *М.)* ...узяты на карысць памешчыцы конь за быццам бы псаванне вулляў»[15]. Ёсць нават прыклады, калі вясковае кіраўніцтва заслугоўвала ўзнагароды ад урада за дапамогу ў падаўленні «беспарадкаў» (часцей за ўсё ў час паўстання 1863 г.), за дбайнае нясенне службы на карысць дзяржавы і г. д.[16] У такіх выпадках службовыя асобы дзейнічалі супраць сваіх жа аднавяскоўцаў, і падобныя ўзнагароды толькі прыніжалі грамадскія пазіцыі кіраўнікоў.

Усё ж сяляне не жадалі мірыцца з дрэнным кіраўніцтвам. Усё сялянскае жыццё было звязана з існаваннем грамады, і простыя абшчыннікі не маглі заставацца безудзельнымі, калі дзеянні тых ці іншых яе членаў разыходзіліся з інтарэсамі грамады, асабліва калі гэта тычылася кіруючых асоб. Паратунак ад дрэннага кіраўніцтва грамада імкнулася знайсці ў вышэйшых інстанцыях. Сяляне адпраўлялі свае скаргі да міравых пасрэднікаў, грамадзянскіх губернатараў, а ў асобных выпадках нават да імператара. Жыхары Невельскага павета Віцебскай губерні, напрыклад, былі незадаволены, што старшына ў супрацоўніцтве з памешчыкам збірае вельмі вялікі аброк, і прасілі імператара прыняць неабходныя меры[17]. Такім чынам, існаванне грамады і дзейнасць яе кіраўніцтва з'яўляліся ў сялянскім уяўленні вельмі важнай справай, займалі не апошняе месца ў сялянскім жыцці.

Аднак не заўсёды грамада памылялася ў сваім выбары. Некаторыя службовыя асобы сапраўды адпавядалі тым якасцям, якімі надзяляла іх грамадская думка. У такіх выпадках аўтарытэт асобы яшчэ больш узвышаўся сярод аднавяскоўцаў. Выбраныя старасты і старшыны разумелі сваю прыналежнасць да агульнага вясковага калектыву, дзейнічалі выключна на сялянскую карысць, атаясамліваючы свае асабістыя інтарэсы з інтарэсамі сельскай грамады. Пра такіх асоб нават у афіцыйных справаздачах сустракаюцца паведамленні, што сяляне высока цэняць іх, знаходзяць у іх асобе абаронцаў закона і парадку[18]. Для праўдападобнага адлюстравання становішча названых кіраўнікоў усё ж трэба дадаць, што спалучаць высокую афіцыйную пасаду і высокую грамадскую павагу на працягу доўгага тэрміну не атрымлівалася, таму што вышэйшае кіраўніцтва вынаходзіла спосабы пазбавіцца ад тых, хто не жадаў дзейнічаць на іх карысць. У такіх выпадках селянін павінен быў выбіраць: ці захаваць павагу грамады, ці пакінуць за сабой уладу ў ёй. У большасці выпадкаў перамагала прага да ўлады.

Прывабнымі пасады стараст і старшын бачыліся сялянам яшчэ і таму, што гэта, як ім здавалася, набліжала іх да прадстаўнікоў вышэйшых саслоўяў. Яны афіцыйна працягвалі заставацца членамі сялянскай супольнасці, але мелі больш значныя сацыяльныя пазіцыі і маглі ўсталёўваць свае правілы. Самавызначэнне сялянскіх службовых асоб было вельмі высокім, але не зусім абгрунтаваным. Свой статус яны атрымлівалі дзякуючы грамадзе і толькі ў яе межах мелі пэўныя паўнамоцтвы і асаблівасці. Калі разглядаць становішча службовых асоб сялянскага самакіравання на ўзроўні міжсаслоўнай стратыфікацыі, то атрымаецца, што яны былі такімі ж членамі

грамады, як і іншыя сяляне. З пункту погляду іншых саслоўных груповак ні старшына, ні стараста не мелі асаблівых адрозненняў у сваім стане. Для вышэйшых улад і саслоўных груп валасныя старшыны і сельскія старасты з'яўляліся ў першую чаргу сялянамі і не мелі ў параўнанні з імі асаблівых паўнамоцтваў. Вось як міравыя пасрэднікі характарызуюць сельскіх службовых асоб: «...яны нічым не адрозніваюцца ад астатніх сялян па разумовым развіцці, не ўсведамляюць сваіх абавязкаў і адчуваюць цяжар ад іх»[19]. Побач з прадстаўнікамі вышэйшага саслоўя сялянскае кіраўніцтва ўжо не паказвала сябе гаспадарамі, нічым не адрознівалася ад астатніх аднавяскоўцаў, адчуваючы сябе толькі падначаленымі. У камісіях, створаных для вывучэння патрэб сельскай гаспадаркі, «побач з губернскім прадвадзіцелем дваранства, нясмела ціснуліся два валасныя старшыны»[20], што з'яўляецца доказам іх невысокага статусу ў адносінах да прадстаўнікоў іншых саслоўяў, чаго нельга сказаць пра адносіны з аднавяскоўцамі. Ужо тое, што службовыя асобы мелі магчымасць зносін з прадстаўнікамі вышэйшых колаў, паднімала іх у вачах простага селяніна на вышэйшую прыступку сацыяльнай лесвіцы. Асабісты сацыяльны статус кіраўніцтва ў такім выпадку, безумоўна, быў вышэйшы за статус простага селяніна. Аднак гэта праяўлялася толькі на неафіцыйным узроўні ўнутрысялянскіх адносін. Афіцыйна ж становішча сялянскіх службовых асоб не выходзіла за межы сялянскага саслоўя. У агульнаграмадскім разуменні яны заставаліся сялянамі - прадстаўнікамі самай прыгнечанай катэгорыі грамадства.

Сялянства ў гістарычнай літаратуры разглядаецца як ніжэйшая і бяспраўная сацыяльная група. Аднак трэба заўважыць, што ўнутры сельскай грамады існавалі свае стратыфікацыйныя падмуркі, якія давалі магчымасці для пэўнага сацыяльнага ранжыравання ў сялянскім асяроддзі, дынамікі індывідуальнага сацыяльнага стану, перамяшчэнняў па сацыяльнай лесвіцы. У жыцці кожнага асобнага селяніна галоўнае месца займала не яго прыніжанае становішча як прадстаўніка сялянскага саслоўя. Нарадзіцца селянінам яму было наканавана, і ніякія асабістыя характарыстыкі на гэта не ўплывалі. Не вызначальным у жыцці сялян было і асабістае стаўленне прадстаўнікоў вышэйшых саслоўяў да іх - селянін разумеў, што паўплываць на такія адносіны таксама не мае магчымасці, бо знаходзіцца на іншых сацыяльных пазіцыях. А вось што было асабліва важным для селяніна - гэта тыя абставіны, якія ён непасрэдна мог змяніць уласнымі намаганнямі, тое, што ўплывала на яго асабістае жыццё, тая пазіцыя, якую ён займаў у сваім паўсядзённым асяроддзі - сельскай грамадзе. Менавіта грамадская думка, адносіны суседзяў-аднавяскоўцаў і мелі для селяніна выключнае значэнне. Праяўленнем высокай павагі і даверу з боку членаў грамады было выбранив пэўнага гаспадара на кіруючую пасаду старасты альбо старшыны. Для таго каб дамагчыся такога аўтарытэту, сяляне імкнуліся паказаць усе свае найлепшыя якасці перад грамадой. У першую чаргу ўвага звярталася на працавітасць, дбайнасць і дабрабыт сялянскай сям'і. Гэтыя характарыстыкі і вызначалі нефармальны статус кожнага селяніна ў вясковым асяроддзі, а таксама давалі магчымасць атрымаць высокую, з пункту погляду сялян, пасаду. Аднак часта здаралася так, што, атрымаўшы яе, гаспадар ужо не клапаціўся аб сваім аўтарытэце сярод простага сялянства, і таму вельмі хутка губляў грамадскую павагу, а гэта магло пагражаць нават стратай афіцыйнай кіруючай пасады. Набыццё ці страта пасады, а таксама перыяд валодання ёй адбіваліся на ўнутрысаслоўных сялянскіх адносінах і на асабістым становішчы прадстаўнікоў сельскага кіраўніцтва ў грамадзе. Грамада магла надаць селяніну высокае становішча, забяспечыць яго павагай і аўтарытэтам і такім жа чынам пазбавіць яго гэтых асабістых прывілей. Адначасова вялікі давер з боку аднавяскоўцаў часта прыводзіў да таго, што селянін, выкарыстоўваючы сваю ўладу, зводзіў іх уплыў на сваё становішча да нуля і сам пачынаў вызначаць умовы існавання грамады, а гэта не магло задаволіць астатніх яе членаў. Фактычна кожны селянін меў магчымасць змяніць свой сацыяльны статус у межах сельскай грамады, набываючы

пэўныя паўнамоцтвы, аднак для іх захавання патрэбна было таксама прыкласці значныя намаганні. Грамада не проста надзяляла селяніна ўладай, але і сачыла за тым, каб ён апраўдаў яе давер і адпавядаў ускладзеным на яго абавязкам і грамадскім патрабаванням.

[1] Гл.: Беларусы: У 9 т. Т. 6. Грамадскія традыцыі. Мн., 2002. С. 19.

[2] Гл.: Псторыя сялянства Беларусі: У 3 т. Т. 2. Ад рэформы 1861 г. да сакавіка 1917 г. Мн., 2002; Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Мн., 2001. Т. 6. Кн. 1; Анфимов A.M., Зыря нов П.Н. Некоторые черты эволюции русской крестьянской общины в пореформенный пе риод (1861-1914 гг.)//История СССР. 1980. №4; Зырянов П.Н. Некоторые черты эволюции крестьянского «мира» в пореформенную эпоху // Ежегодник по аграрной истории Восточной Европы, 1971 г. Вильнюс, 1974.

[3] Гл.: Беларусы... 2002; Грамадскі быт і культура сельскага насельніцтва Беларусі. Мн., 1993.

[4]Гл.: Панютич В.П. Социально-экономическое развитие белорусской деревни в 1861— 1900 гг. Мн., 1990; Талмачова С.А. Некаторыя аспекты ўплыву паўстання 1863-1864 гг. на сялянскае самакіраванне на Беларусі // Германский и славянский миры: взаимовлияние, конфликты, диалог культур (история, уроки, опыт, современность): Материалы междунар. науч.-теорет. конф. Витебск, 2001; Яна ж. Рэалізацыя вытворчай функцыі органамі сялянскага самакіравання ў Беларусі (1861-1901 гг.) // Весці БДПУ. Сер. 2. 2002. № 3; Яна ж. Рэалізацыя паліцэйскай функцыі органамі сялянскага самакіравання ў Беларусі (1861-1914) // Псторыя Беларусі: новае ў даследаванні і выкладанні: Матэрыялы Рэсп. навук.-практ. канферэнцыі, прысвечанай 80-годдзю БДПУ імя М. Танка, Мінск, 25 кастр. 2002 г. Мн., 2002. Вып. 2; Яна ж. Сялянскае самакіраванне на Беларусі ў час паўстання 1863-1864 гг. // Весці БДПУ. Сер. 2. 2001. №4.

[5]Талмачова С. А. Сялянскае самакіраванне на Беларусі ў час паўстання 1863-1864 гг. // Весці БДПУ. Сер. 2. 2001. № 4. С. 130.

[6] Гл.: Беларусы: У 9 т. Т. 4. Вытокі і этнічнае развіццё. Мн., 2001. С. 257.

[7]Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). Ф. 242. Воп. 1. Спр. 2158. Л. 2.

[8]Гл.: Дембовецкий А.С. Опыт описания Могилевской губернии в историческом, физико-географическом, этнографическом, промышленном, сельско-хозяйственном, лесном, учебном, медицинском и статистическом отношениях. Могилев-на-Днепре, 1884. Кн. 3. С. 500.

[9] Гл.: Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Гродна (НГАБ у г. Гродна). Ф. 1. Воп. 20. Спр. 524. Л. 13.

[10] Гл.: НГАБ. Ф. 242. Воп.1. Спр. 126.

[11]НГАБ. Ф. 2642. Воп. 1. Спр. 100. Л. 148.

[12]Тамжа. Л. 117.

[13] НГАБ у г. Гродна. Ф. 12. Воп. 3. Спр. 266. Л. 7а.

[14] Там жа. Л. 1.

[15] НГАБ. Ф. 2642. Воп. 1. Спр. 100. Л. 63.

[16] Там жа. Спр. 177; Ф. 242. Воп.1. Спр. 126,1953.

[17]Тамжа. Спр. 115. Л. 83.

[18] Там жа. Спр. 150. Л. 2. [19]НГАБ. Ф. 242. Воп. 1. Спр. 417. Л. 10.

[20]Титов А.А. Крепостное право, его отмена и судьба крестьянства до наших дней. М., 1907. С. 66.

Паступіў у рэдакцыю 31.05.07.

***Ганна Іванаўна Маскевіч*** - аспірант кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу. Навуковы кіраўнік - кандыдат гістарычных навук, дацэнт, загадчык кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу А.Г. Каханоўскі.